**Віталь Гарматны**
(Мінск)

# Правядзенне камасацыі ў вёсцы Хацілкі Свірскай гміны Свянцянскага павета Віленскага ваяводства ў 1926-1931 гг.

Па выніках савецка-польскай (1919-1921 гг.) вайны Заходняя Беларусь увайшла ў склад адроджанай Польшчы (ІІ Рэчы Паспалітай). Сельская гаспадарка краю асабліва пацярпела пад час вайны і прыйшла ў поўны заняпад, акрамя таго ў аграрнай сферы назіраўся цэлы шэраг перажыткаў з часоў прыгону, галоўным з якіх была цераспалосіца — наяўнасць у большасці заходнебеларускіх сялян некалькіх зямельных надзелаў, размешчаных у аддаленых мясцовасцях. На 30 верасня 1921 г. у Заходняй Беларусі паводле даных сельскагаспадарчага перапісу налічвалася 349 239 самастойных сялянскіх гаспадарак з надзеламі да 50 га, якія валодалі 2 392 388 га зямлі[1]. Каля 207 900 гаспадарак заходнебеларускіх сялян былі цераспалоснымі і вузкапалоснымі: з іх сяляне, якія мелі ад 1 да 2 га зямлі складалі 14,8%, ад 2 да 5 га — 44,2%, ад 5 да 10 га — 29,5%, ад 10 да 20 га — 9,6%, ад 20 да 50 (заможныя сяляне) — 1,9%. Такім чынам, 59% цераспалосных гаспадарак прыходзілася на малазямельныя з надзелам да 5 га і толькі 1,9% складалі гаспадаркі заможных сялян з надзеламі ад 20 да 50 га[2]. 40% гаспадарак усходніх ваяводств мелі некаторыя зямельныя надзелы шырынёю ад 1 да 2 метраў, а 14% гаспадарак — нават з шырынёю менш 1 метра, з-за чаго на такіх вузкіх надзелах селяніну з канём было цяжка нават развярнуцца.

З мэтаю ліквідацыі цераспалосіцы і паляпшэння аграрных адносін польскія ўлады на падставе прынятага Сеймам Другой Рэчы Паспалітай закону ад 31 ліпеня 1923 г. праводзілі ў Заходняй Беларусі, Заходняй Украіне і некаторых мясцовасцях карэннай Польшчы, якія раней знаходзіліся ў складзе Расійскай Імперыі, камасацыю (хутарызацыю)[3].

Ініцыятарам правядзення ссялення маглі быць уладальнікі агульнаю плошчаю не менш як 25 га, падпадаючых пад камасацыю, а калі абшар

[1] А. А. Сорокин, *Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920-1939 гг.)*, Минск 1968, с. 100.

[2] Б. Е. Кухарев, *Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919-1939 гг.)*, Минск 1975, с. 34.

[3] П. І. Зялінскі, *Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1919-1939 гг.)*, [у:] *Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі 17-18 верасня 1999 года, Мінск, БДУ*, Мінск 2000, с. 28.

ссялення не перавышаў 200 га — уладальнікі не менш 1/10 зямлі (артыкул 14)[4]. Просьбы аб правядзенні ссялення падаваліся ў павятовую зямельную ўправу, якая павінна на месцы высветліць сапраўдны стан рэчаў, а ў выпадку патрэбы іншых органаў улады — запраектаваць абшар ссялення, які з поглядаў гаспадарчых і тапаграфічных належыць праводзіць адначасова. Перад правядзеннем камасацыі мясцовыя ўлады складалі падрабязны план работ па яе ажыццяўленню, заключалі папярэднюю дамову з землямерам аб тэрмінах і ходзе выканання планаваных работ, умовах аплаты выкананай працы і г.д. Так, напрыклад, 11 кастрычніка 1926 г. 10 сялян вёскі Хацілкі Свірскай гміны Свянцянскага павета Віленскага ваяводства падалі ў мясцовую ваяводскую зямельную ўправу прашэнне аб ажыццяўленні камасацыі (разбіўкі на хутары) сваёй вёскі[5]. Вёска Хацілкі знаходзілася ў адлегласці 5 кіламетраў ад цэнтра гміны і пошты, за 43 кіламетры ад павятовага старасства ў Свянцянах і за 15 кіламетраў ад бліжэйшай чыгуначнай станцыі Канстантынаў. Землі мясцовыя былі ў асноўным неўраджайныя і камяністыя[6].

14 лістапада 1926 г. у вёсцы Хацілкі пад кіраўніцтвам мясцовага солтыса (старасты) Фелікса Саленіка адбыўся грамадскі сход па пытанню правядзення камасацыі[7], на якім з мэтаю ўстанаўлення фактычнага стану рэчаў прысутнічаў павятовы зямельны падкамісар Баляслаў Быкоўскі[8]. Першапачаткова ў вёсцы існавала 24 зямельныя надзелы, але з цягам часу колькасць карыстальнікаў зямлі павялічылася да 45 гаспадароў. Агульны абшар сялянскіх зямель складаў каля 550,56 га. Надзяленне зямлёю мясцовых малазямельных сялян пры камасацыі было немагчымым з-за адсутнасці запасу ворных зямель. Кожны гаспадар з вёскі Хацілкі валодаў у сярэднім 6 зямельнымі надзеламі ў 3 мясцовасцях. Шырыня сялянскіх надзелаў складала ў сярэднім каля 5 метраў, а даўжыня прыкладна 900 метраў[9]. У такіх складаных абставінах правядзенне ў вёсцы камасацыі было для мясцовых сялян жыццёва неабходна.

На грамадскім сходзе жыхары вёскі Хацілкі былі падрабязна праінфармаваны прадстаўнікамі польскіх улад аб праведзеных вымярэннях, аб працэдуры ссялення, правах і абавязках удзельнікаў ссялення, а таксама пра расцэнкі на ажыццяўленне хутарызацыі. З прысутных на сходзе 45 сялян на правядзенне камасацыі пагадзіліся 13 (агульная плош-

[4] Ustawa z dnia 31 lipca 1923 r. o scalaniu gruntów, [w:] Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej, 1923, nr 92, poz. 718, s. 1050-1056.

[5] Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна, ф. 306, воп. 1, спр. 21, арк. 1. Дело о разбивке на хутора земель дер. Хотилки.

[6] Там жа, арк. 183.

[7] Там жа, арк. 5.

[8] Там жа, арк. 18.

[9] Там жа, арк. 5зв., 35.

ча зямельных уладанняў 154,40 га), супраць былі 17[10]. Трэба адзначыць, што паводле закону ад 31 ліпеня 1923 г. (артыкул 14b) камасацыя ў вёсцы магла праводзіцца пры згодзе нават некалькіх мясцовых гаспадароў, якія сумесна валодалі не менш 25 га зямлі, таму польскія ўлады вырашылі правесці ў Хацілках камасацыю[11]. Такім чынам, па пытанню правядзення хутарызацыі меркаванні жыхароў вёскі Хацілкі разыходзіліся радыкальным чынам, а польскія ўлады падтрымалі прыхільнікаў камасацыі.

30 лістапада 1926 г. у Свянцянскую павятовую зямельную ўправу было накіравана паданне 32 (але толькі 7 з іх мелі права голасу) сялян вёскі Хацілкі, якія выказвалі сумненне ў неабходнасці правядзення ў вёсцы камасацыі і прасілі ўлады адтэрмінаваць ажыццяўленне хутарызацыі ў сувязі з тым, што:

„1. Усялякая радыкальная змена, а асабліва так глыбока датычная сістэмы сельскай гаспадаркі, як камасацыя, ёсць заўсёды аперацыя балючая, а тым больш у сувязі з цяжкім станам гаспадарчым і крызісам эканамічным, які мы перажываем. Жадаем праз гэтае (паданне) пацвердзіць, што згода звычайная не выказана, акрамя тых, хто згодзен на правядзенне камасацыі (і мы згодны на камасацыю ў выпадку), калі яна пройдзе без жахлівых для нас наступстваў, толькі пад уплывам звычайнай гаспадарчай дэпрэсіі;

2. У вёсцы Хацілкі на месцы адзначаецца значная перавага дробных гаспадарак, якія можна залічыць нават да карлікавых. У гэтых умовах, улічваючы таксама такую акалічнасць, як адсутнасць запасу зямель, якія маглі б быць выкарыстаны да надзялення зямлёю бяднейшых гаспадароў — цяжка так правесці камасацыю, каб закранутыя ёю гаспадаркі асабліва не пацярпелі;

3. Кідаецца ў вочы кожнаму, хто бачыў калі-небудзь землі вёскі Хацілкі, што значная частка іх неўраджайная, акрамя таго назіраецца значная доля балот і таму падобных няўжыткаў. Неналежна таксама аспрэчваць тое, што акрамя таго, магчымасць ацэнкі (мясцовых) гаспадарак на (грашовую) вартасць (...) ёсць вельмі праблематычная, каб не сказаць немагчымая, у сэнсе выканання неабходных памераў без уніклівага абмеру.

На падставе вышэйадзначанага паведамляем, што ў сувязі з цяжкім неспрыяльным становішчам для правядзення камасацыі, просім улады аб трохгадовай адтэрміноўцы, пад час якой частка (мясцовых) гаспадароў магла б свае (зямельныя) надзелы ў вёсцы Хацілкі прадаць, а набыць іх дзе-небудзь у лепшых для сябе ўмовах”[12].

[10] Там жа, арк. 7зв.-8.
[11] Там жа, арк. 18.
[12] Там жа, арк. 17.

17 сакавіка 1927 г. польскімі ўладамі быў падрыхтаваны вопіс і праект ссялення вёскі Хацілкі. Польскія ўлады адзначалі, што права ўласнасці мясцовых сялян на зямлю пацвярджаецца натарыяльна заверанымі дакументамі і што „правядзенне (ў вёсцы Хацілкі) ссялення будзе садзейнічаць выпраўленню мясцовых аграрных стасункаў і стварэнню здаровых (сялянскіх) гаспадарак"[13].

12 красавіка 1927 г. 4 сялян вёскі Хацілкі падалі ў Свянцянскую павятовую зямельную ўправу хадайніцтва, у якім прасілі павятовага зямельнага камісара як мага хутчэй правесці ў іх вёсцы камасацыю, бо „ад гэтага залежыць наш дабрабыт"[14]. 5 мая 1927 г. Віленская акруговая зямельная ўправа (ВАЗУ) на сваім пасяджэнні на чале са старшынёю Віленскага акруговага зямельнага суда Станіславам Ляшчынскім прыняла рашэнне аб правядзенні ў вёсцы Хацілкі камасацыі.

20 верасня 1927 г. у Галоўную зямельную ўправу (ГЗУ) II Рэчы Паспалітай паступіла скарга некалькіх сялян вёскі Хацілкі, якія не былі згодны з правядзеннем камасацыі[15].

7 лістапада 1927 г. сяляне вёскі Хацілкі Альбін і Міхаіл Бялевічы звярнуліся ў ВАЗУ з просьбаю аб зацвярджэнні праекта камасацыі вёскі і перадачу сялянам зямель навакольнага фальварка Надбрэжжа і тых надзелаў, гаспадары якіх знаходзяцца па-за межамі польскай дзяржавы і ўстанавіць іх дакладнае месцазнаходжанне немагчыма[16].

25 лістапада 1927 г. на пасяджэнні ГЗУ на чале з віцэ-старшынёю Э. Зеляхоўскім было разгледжана пытанне правядзення ў Хацілках камасацыі. Сяляне скардзіліся, што не мелі дастаткова ворнай зямлі, фінансавых сродкаў і будматэрыялаў на перанясенне сваіх сядзіб і таму на ссяленне пагаджалася толькі 10 мясцовых жыхароў, у кожнага з якіх было не менш як па 5 га зямлі. Уладамі было вырашана аставіць скаргі сялян без задавальнення як незаслугоўваючыя ўвагі. Акрамя таго адзначалася, што надзяленне малазямельных сялян зямлёю пад час ажыццяўлення камасацыі знаходзіцца не ў кампетэнцыі ГЗУ, а належыць да сферы дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі. Цяжкае матэрыяльнае становішча планавалася палепшыць праз выданне ільготных крэдытаў і правядзенне меліярацыі, а праект камасацыі вёскі вырашана было зацвердзіць[17].

5 красавіка 1928 г. 14 сялян вёскі Хацілкі — уладальнікаў карлікавых гаспадарак — звярнуліся ў Міністэрства сельскай гаспадаркі з просьбаю перадачы на надзяленне іх зямлёю двух надзелаў фальвар-

[13] Там жа, арк. 18зв.
[14] Там жа, арк. 22.
[15] Там жа, арк. 20.
[16] Там жа, арк. 21.
[17] Там жа, арк. 33, 37-38.

ка Надбрэжжа, падзеленага на насаджэнне асаднiцтва, цi аб перадачы на гэтую мэту свабоднага зямельнага надзела ў суседнiм маёнтку Дабраўляны цi некаторых iншых. Сяляне выказвалi надзею, што мiнiстэрства, якое ў сiлу абставiн сваёй дзейнасцi ведае аб становiшчы дробнага селянiна, i звяртае ўвагу „на анамальнае становiшча нашых гаспадарак, не даючае нам мажлiвасцi (забеспячэння нармальнага) пражыцця з раднёю”[18].

13 студзеня 1929 г. ВАЗУ паведамляла ў Мiнiстэрства сельскай гаспадаркi аб сваiм рашэннi правесцi надзяленне сялян вёскi Хацiлкi ворнаю зямлёю з дзяржаўнага маёнтка Дабраўляны, папярэдне праектаванага для застаўлення пад лесам, аб чым сяляне былi праiнфармаваны на грамадскiм сходзе 23 верасня 1928 г.[19]

9 мая 1929 г. у вёсцы Хацiлкi па пытанню правядзення камасацыi адбыўся грамадскi сход сялян, на якiм з 45 самастойных мясцовых гаспадароў прысутнiчаў 41 чалавек. На сходзе ў дапамогу ўрадаваму землямеру была абрана мясцовая рада ссялення (rada uczestników scalenia) у колькасцi 5 членаў:

1) Пац Францiшак, сына Пятра;
2) Бялевiч Вiнцэнт, сына Ежы;
3) Санюк Ян, сына Тамаша;
4) Сыпко Элiаш, сына Яна;
5) Сухаржэўскi Андрэй, сына Адама.

У дапамогу членам рады ссялення былi абраны 5 iх намеснiкаў (zastępców):

1. Саленiк Мiкалай, сын Мiхаiла;
2. Бялевiч Альбiн, сын Юзэфа;
3. Санюк Зыгмунт, сын Тамаша;
4. Мiтыневiч Францiшак, сын Францiшка;
5. Санюк Ян, сын Яна[20].

11 жнiўня 1929 г. у якасцi членаў Ацэначнай камiсii зямель (Komisji Szacunkowej) на грамадскiм сходзе сялян вёскi Хацiлкi былi аднагалосна абраны жыхар вёскi Хведзевiчы Сыпко Юзэф, сын Iгната, i жыхар вёскi Руднiшкi Сымановiч Балеслаў, сын Францiшка, а таксама жыхар вёскi Купчышчына-II Элiаш Севярын, сын Яна, у якасцi iх намеснiка, як асабiста незацiкаўленыя асобы i добра ведаючыя мясцовыя стасункi i ўмовы глебы[21].

[18] Там жа, арк. 26-26зв.
[19] Там жа, арк. 40.
[20] Там жа, арк. 42.
[21] Там жа, арк. 62.

13 жніўня 1929 г. каля 8 гадзін раніцы ў вёсцы Хацілкі распачала сваю працу Ацэначная камісія на чале з землямерам Людвікам Пазняком. Уся сялянская зямля па паказчыках ураджайнасці была падзелена на сем класаў, у адпаведнасці з чым вызначаўся і яе рынкавы кошт. У якасці найлепшых грунтоў былі вызначаны землі ва ўрочышчы „Каменіца", якія ацэньваліся па 100 злотых за 1 га: грунты гліністыя з пладародным слоем каля 20 сантыметраў, пад якім пясок, даючыя добры ўраджай пшаніцы, ячменю, жыта; у якасці найгоршых — землі ўрочышча „Піскпевіца": грунты пясчаныя, пад якім жвір, па кошце 5 злотых за 1 га[22]. Ворная зямля сялян вёскі Хацілкі была падзелена камісіяй на 7 класаў: глеба II класа — гліністая, пад ёю пясок, грунты сельскагаспадарча добрыя, часткова залічаныя да I класа; III класа — глебы разнастайныя, у асноўным пясчаныя і гліністыя, з даволі добраю ўраджайнасцю; IV класа — глебы камяністыя; V класа — глебы камяністыя ці з дамешкам вапны; VI класа — камяністыя, глыбоказярністыя, ці пяскі наджвіравыя, цяжкія да сельскагаспадарчай апрацоўкі; VII — не падыходзячыя да сельскагаспадарчай апрацоўкі. Глеба I класа каштавала 100, II — 80, III — 60, IV — 40, V — 20, VI — 10, VII — 5 злотых за 1 га[23].

20-21 верасня 1929 г. Л. Пазняк прыступіў да правядзення неабходных памераў у Хацілках з мэтаю ўстанаўлення старога стану зямельных адносін і складання спісу пажаданняў сялян[24]. 26 верасня 1929 г. грамадскім сходам сялян вёскі ў колькасці 33 чалавек зацверджаны вопіс стану сялянскіх уладанняў перад ссяленнем, акрамя таго мясцовыя сяляне абавязваліся на працягу наступных 3 гадоў перанесці свае будынкі і перайсці на новыя зямельныя надзелы[25]. У адпаведнасці са складзеным спісам, селянін Бялевіч Альбін, сын Юзэфа, напрыклад, валодаў 1/2 першапачатковага надзела № XII (9,7456 га агульным коштам у 550,52 злотага) і жадаў атрымаць зямлю ва ўрочышчы „Аляксееў ручэй"; селянін Зянкевіч Марэк, сын Мацея, валодаў 1/3 зямельнага надзела № XII (6,4971 га на 367,01 злотага) і збіраўся набыць дадатковую зямлю з маёнтка Дабраўляны і ва ўрочышчы „Дзікае балота" і таму прасіў выдзяліць яму зямлю ў гэтых мясцовасцях; сялянка Бялевіч Марыя, дачка Яна, валодала 1/6 надзела № XII (3,2486 га на 183,50 злотага) і спадзявалася атрымаць зямлю вакол сваёй сядзібы[26].

27 студзеня 1930 г. ВАЗУ дазволіла сялянам вёскі Хацілкі купіць у памешчыка Юзэфа Бліжэўскага, жыхара вёскі Лынтупы Лынтупскай гмі-

[22] Там жа, арк. 71.
[23] Там жа, арк. 82.
[24] Там жа, арк. 48.
[25] Там жа, арк. 60-61.
[26] Там жа, арк. 83.

ны Свянцянскага павета, у яго маёнтку „Болкаўшчына” („Болкаў”) надзел зямлі ва ўрочышчы „Карчма” памерам 0,9180 га за 500 злотых: пры гэтым Вінцэнт Бялевіч купіў 0,1836 га зямлі, Віктар Радзіўш — 0,0918 га, Францішак Мітыневіч — 0, 918 га, Ян Санюк — 0,4590 га і Міхаіл Цівуновіч — 0,0918 га. 11 чэрвеня 1930 г. выконваючым абавязкі натарыуса Іпатэчнай канцылярыі Акруговага суда ў Вільні Стэфанам Пржэўлоцкім зарэгістравана вышэйазначаная дамова куплі-продажу зямлі пад № 1692, а за яе юрыдычнае афармленне з сялян было ўзята 5 злотых і 10% дадаткова (50 грошаў) паводле артыкула 58 Штэмплевага закону, 2 злоты 50 грошаў на карысць Свянцянскага павятовага сейміка і 30 злотых на карысць натарыуса згодна артыкула 2 Закону аб натарыяльных расцэнках[27].

7 лютага 1930 г. землямерам Л. Пазняком быў складзены агульны план вёскі Хацілкі плошчаю 518,7534 га (з улікам 45,1191 га з маёнтка Дабраўляны) і вартасцю 27 610,05 злотага. Дамінуючае месца ў сялянскім землекарыстанні займалі грунты III класа, аб чым сведчыць наступная табліца:

## ПЛАН ЗЯМЕЛЬ ВЁСКІ ХАЦІЛКІ, 1930 г.

| Тып зямель | Клас зямель | Плошча, у га | Вартасць, у злотых |
|---|---|---|---|
| Сядзібы | I | 20,7130 | 3106,95 |
| | II | 1,1827 | 141,92 |
| Ворныя землі | I | 49,7880 | 4978,80 |
| | II | 47,6650 | 3813,20 |
| | III | 61,3363 | 3680,18 |
| | IV | 21,4356 | 857,42 |
| | V | 43,0260 | 860,52 |
| | VI | 19,4850 | 194,85 |
| | VII | 4,6015 | 23,01 |
| Лугі | I | 15,5100 | 1551,00 |
| | II | 17,3580 | 1388,64 |
| | III | 109,7950 | 5489,75 |
| | IV | 24,6085 | 738,25 |
| | V | 54,3620 | 543,62 |
| | VI | 0,4981 | 14,94 |
| | VII | 22,7000 | 227,00 |
| Паша | Без класа | 4,6887 | |
| **Разам** | | 518,7534 | 27610, 05 |

Крыніца: Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна, ф. 306, воп. 1, спр. 21, арк. 187зв.

5 чэрвеня 1930 г. землі маёнтка Дабраўляны ў памеры 45,1191 га былі падзелены паміж сялянамі вёскі Хацілкі наступным чынам:

1. Саленік Ян, сын Вінцэнта, атрымаў 4,5119 га;
2. Саленік Баляслаў, сын Міхаіла — 4,5119 га;

[27] Там жа, арк. 194-196.

3. Пацук Фелікс, сын Вінцэнта — 4,5119 га;

4. Талуц Юзэф, сын Рамуальда, і Цівуновіч Ядвіга, дачка Фелікса, з маці Марыяй — 4,5119 га;

5. Цівуновіч Зыгмунт, сын Антонія, з братам Альфонсам, сёстрамі Геленай, Марыяй і маці Канстанцыяй — 4,5119 га;

6. Пацук Эмілія, дачка Вінцэнта — 1,8048 га;

7. Скробутанава Мальвіна, дачка Вінцэнта — 4,5119 га;

8. Санюк Ян, сын Тамаша — 2,7071 га;

9. Санюк Малання, якая апрацоўвала надзел свайго знаходзячагася ў Амерыцы мужа Фелікса — 2,7071 га;

10. Санюк Зыгмунт, сын Тамаша — 3,6095 га;

11. Бялевіч Разалія, дачка Ежы — 1,8048 га;

12. Яцуна Цаліна, жонка Антонія — 5,4144 га[28].

22 снежня 1930 г. Свянцянскі павятовы зямельны падкамісар Аттон Казлоўскі сабраў па пытанню камасацыі грамадскі сход сялян вёскі Хацілкі, на якім прысутнічала 42 з 49 мясцовых самастойных гаспадароў. Па выніках правядзення ў вёсцы камасацыі агульная плошча сялянскіх надзелаў з улікам зямель маёнтка Дабраўляны складала 518 гектараў 7534 кв. метраў. Землі сялян вёскі Хацілкі былі падзелена на 49 самастойных асабістых надзелаў: у тым ліку 49 ворных, 1 з сядзібаю, 13 з лугам, 2 грамадскага карыстання, 13 — дзяржаўнай уласнасці. На грамадскім сходзе сяляне сумесна з прадстаўнікамі польскай адміністрацыі пастанавілі зацвердзіць праект ссялення вёскі Хацілкі як адпавядаючы закону аб камасацыі ад 31 ліпеня 1923 г. і ўмовам вядзення рацыянальнай сельскай гаспадаркі[29].

22 мая 1931 г. на пасяджэнні ВАЗУ на чале са Станіславам Ляшчынскім была разгледжана справа аб правядзенні ў вёсцы Хацілкі Свірскай гміны Свянцянскага павета Віленскага ваяводства камасацыі і зацверджаны праект ссялення вёскі як адпавядаючы дзейнічаючаму ў краіне заканадаўству. У пастанове адзначалася, што яна не з'яўляецца канчатковаю і можа быць абскарджана на працягу наступных 14 дзён, але скарг сялян разгляданай вёскі больш не паступала[30].

Такім чынам, за 1926-1931 гг. польскімі ўладамі ў вёсцы Хацілкі Свірскай гміны Пастаўскага павета Віленскага ваяводства была праведзена хутарызацыя і мясцовыя сяляне змаглі больш эфектыўна і паспяхова весці асабістую сельскую гаспадарку дзякуючы звядзенню ў адзін надзел раскіданых сялянскіх зямельных уладанняў, стварэнню хутара і памяншэнню такім чынам колькасці неабходных для апрацоўкі асабіста-

[28] Там жа, арк. 193.
[29] Там жа, арк. 229.
[30] Там жа, арк. 229.

га надзела сялянскіх працадзён. Паспяховае правядзенне камасацыі было немагчымым без адначасовага надзялення зямлёю малазямельных сялян.

**Wital Harmatny** — magister historii, student drugiego roku studiów aspiranckich na Wydziale Historii Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego w Mińsku. Pisze pracę doktorską na temat „Komasacja na ziemiach Zachodniej Białorusi w latach 1921-1939" pod kierunkiem prof. Piotra Zielińskiego z Katedry Historii Nowożytnej i Współczesnej Białorusi BUP. W czerwcu 2007 r. obronił w BUP pod kierownictwem prof. P. Zielińskiego pracę magisterską na temat „Reforma agrarna w województwie poleskim (1921-1939)".